«Ну, такі каток харошы!»



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Не конь вязе, але дарога, не бог памагае, але ... (прык.). **6.** Імя некалі вельмі шанаванага на Беларусі бога жывёлагадоўлі і багацця. **9.** Невялікі глухі завулак. **11.** Тое, што і гатунак. **12.** Конь у гаспадарцы — ... (прык.). **13.** Жылі разам ... ды баран, сена жмуток — і той папалам (прык.). **16.** Вечназялёная расліна, якая паразітуе на іншых дрэвах. **17.** Вучнёўская або вайсковая сумка. **20.** На ваўка ..., а авечак цягае Сава (прык.). **22.** «Будзь здарова, як ..., а плодна, як свіння». Зычэнне пры чханні. **25.** Добра мядзведзя ў ... дражніць (прык.). **26.** І свіння ..., калі мукі скрыня (прык.). **28.** «Мужчына — адзіны ..., які б'е сваю самку». Ж. Куртэлін. **29.** ... плача, а воўк скача (прык.); з 28 лістапада пачаўся Піліпаўскі пост, калі ваўкі збіраюцца ў зграі і ладзяць воўчыя «вяселлі».

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. «У сабакі да чалавека толькі адна ...: «Любі мяне!». Х. Экслі. **2.** Першая літара старажытнаславянскага алфавіта. **3.** Хто жывёлу даглядае, той масла і ... мае (прык.). **4.** ... ды гагара — два чобаты пара (прык.). **5.** Не лезь, ..., туды, дзе коней куюць (прык.). **7.** Пра добрае бясхмарнае надвор'е. **8.** «Бяры ... залатое, // Сядлай каня варанога». З валачобнай песні. **10.** Ну, такі каток харошы, // Як ... за тры грошы». З верша Я. Коласа «Савось-распуснік». **13.** Горад на Брэстчыне, дзе ўстаноўлены цёплыя домікі для бяздомных катоў і дзе зроблена першая ў краіне пляцоўка для выгулу сабак, абсталяваная па ўсіх еўрапейскіх правілах. **14.** Добра курыцы і ... (прык.). **15.** Іх двое — парачка, баран ды ... (прык.). **18.** Багаты ...: ёсць казёл і кошка (прык.). **19.** Адна з назваў Спаса, старажытнага земляробчага свята. **21.** Гора табе, ..., калі цябе карова коле (прык.). **22.** Вялікі памазок з пакулля, рагожы. **23.** Караняплод. **24.** ... вымые, а хлеб выкарміць (прык.). **27.** Буйная жвачная жывёліна з доўгай поўсцю.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Пуга. 6. Вялес. 9. Закавулак. 11. Сорт. 12. Бацька. 13. Казёл. 16. Амяла. 17. Ранец. 20. Слава. 22. Карова. 25. Акно. 26. Гаспадыня. 28. Самец. 29. Каза.

Па вертыкалі: 1. Просьба. 2. Аз. 3. Сала. 4. Гусь. 5. Жаба. 7. Ясна. 8. Сядло. 10. Драпянка. 13. Кобрын. 14. Зярнятка. 15. Ярачка. 18. Цімошка. 19. Іспас. 21. Воле. 22. Квач. 23. Рэпа. 24. Вада. 27. Як.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.26	16.48	7.22
Віцебск —	9.23	16.30	7.07
Магілёў —	9.16	16.38	7.22
Гомель —	9.04	16.44	7.40
Гродна —	9.39	17.05	7.26
Брэст —	9.31	17.14	7.43

Месяц

Першая квадра 15 снежня.
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Антона, Івана, Міхаіла, Нікіфара, Ніла, Паўла, Сяргея.*
К. *Дамініка, Ігната, Яўгена.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



Ну і ну!

Здалі ў краму чужыя туфлі

І на атрыманыя грошы павячэралі фастфудам.

У Першамайскае РУУС сталіцы звярнулася мінчанка з заявай аб крадзяжы туфляў. Жанчына набыла іх у гандлёвым цэнтры і навіной аб куплі паспяшалася падзяліцца з сяброўкамі па мабільным тэлефоне. Падчас размовы яна адышла ад лаўкі, дзе пакінула туфлі, а калі вярнулася праз пару хвілін, то пакупкі ўжо на ранейшым месцы не аказалася.

Міліцыянеры ўстанавілі падазраваных у крадзяжы. Імі аказаліся двое 14-гадовых падлеткаў, якія з'яўляюцца навучэнцамі ўстаноў адукацыі сталіцы. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў высветлілі, што хлопцы заўважылі пакінутую без нагляду скрынку з чэкам. Далей знайшлі краму, дзе абутак набываўся, вярнулі туфлі і атрымалі за іх грошы — 85 рублёў. Прадаўцу сказалі, што маці абутак не падышоў, і яна папрасіла вярнуць сродкі. Пасля падлеткі выдаткавалі іх на фудкорт таго ж гандлёвага цэнтра.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даты | Падзеі | Людзі

20 СНЕЖНЯ

1840 год — нарадзіўся (в. Дэмбрава, цяпер у Шчучынскім раёне) Казімір Дамінікавіч Альхімовіч, беларускі жывапісец і ілюстратар. Прадстаўнік позняга рамантызму і рэалізму ў беларускім жывапісе XIX — пач. XX ст. Вучыўся ў Віленскай гімназіі. За ўдзел у паўстанні 1863—1864 гадоў быў сасланы ў Сібір. Пасля вяртання жыў у Варшаве, скончыў з адзнакай Мюнхенскую акадэмію мастацтваў. У 1876—1878 гадах жыў у Парыжы. Удзельнічаў у выстаўках Варшаўскага таварыства заахвочвання мастацтваў і Салона ў Парыжы. Працаваў у міфалагічным, гістарычным, партрэтным жанрах. Аўтар гістарычных палотнаў: «Пахаванне Гедыміна», «Пасля бітвы», «Смерць Глінскага ў турме» і іншых. Па матывах творчасці А. Міцкевіча стварыў серыю карцін і 12 ілюстрацый да яго паэмы «Пан Тадэвуш». Памёр у 1916 годзе.

1899 год — нарадзіўся (в. Вялікая Вобрына, цяпер у Карэліцкім раёне) Уладзімір Зянонавіч Царук, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Стаўбцоўскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944). Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1920 года на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі, сакратар Мірскага падпольнага райкама КПЗБ. У 1926—1939 гадах польскімі ўладамі пасаджаны ў турму. У Вялікую Айчынную вайну быў сакратаром Стаўбцоўскага падпольнага міжрайкама КП(б)Б, памочнікам упаўнаважанага Беларускага штаба партызанскага руху па Мірскім і Стаўбцоўскім раёнах, з ліпеня 1943-га — член Баранавіцкага падпольнага абкама КП(б)Б, кіраўнік Стаўбцоўскага падпольнага міжрайпартцэнтра, камандзір Стаўбцоўскага партызанскага злучэння. Пасля вайны быў на партыйнай і савецкай рабоце ў Стоўбцах і Баранавічах. Памёр у 1957 годзе.

1928 год — Уладзіславу Галубку першаму ў Беларусі прысвоена ганаровае званне народнага артыста Беларускай ССР.

1932 год — прынята пастанова ЦВК і СНК БССР «Аб аб'яўленні Беларускай ССР краінай суцэльнай пісьменнасці».

1945 год — зацверджаны статут Міжнароднага ваеннага трыбунала, на падставе якога быў праведзены Нюрнбергскі працэс над галоўнымі ваеннымі злачынцамі фашысцкай Германіі, Такійскі працэс для вынясення прысуду галоўным японскім ваенным злачынцам, а таксама судовыя працэсы аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у СССР і іншых краінах.

1971 год — заснавана міжнародная арганізацыя «Урачы без межаў», лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1999).

УСМІХНЕМСЯ

Аб'ява.

«У зладжаны працоўны калектыў патрабуецца заўзяты лайдак і разгільдзяй у якасці негатыўнага прыкладу для большай згуртаванасці работнікаў».

— Прывітанне! Што было добрага, пакуль мяне не было?

— Усё было добра, пакуль цябе не было.

Рамантык — гэта калі ў мінус 30 рана раніцай садзішся ў аўтобус не з таго боку, дзе печка, а з таго, дзе світанак.

Уткнуўся носам у даччыную макушку і зразумеў, як пахне шчасце.

Уткнуўся носам у жонку і зразумеў, хто крадзе мой гель для душа!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4532.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 снежня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12